■ Шляхамі пісьменніка

# Да Быкава ў Бычкі



## Напярэдадні 90-й гадавіны з дня нараджэння пісьменніка карэспандэнт «Звязды» пабываў на яго малой радзіме

**Сваякі знакамітага на ўвесь свет пісьменніка расказалі, што Васіль Уладзіміравіч быў вельмі добрым чалавекам, маўклівым, не сквапным і зусім не «зорным». І гэта пры тым, нагадаю, што ён быў лаўрэатам дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Героем Сацыялістычнай Працы, народным пісьменнікам Беларусі...**



Мікалай ХАРАК каля партрэта свайго дзядзькі.

### «БЫКАЎ АДВЁЗ МЯНЕ ПА НЯВЕСТУ»

Каля сядзібы-музея В.У. Быкава ў вёсцы Бычкі пазнаёміўся з Мікалаем Мікалаевічам Хараком. Ён жыве ў суседнім аграгарадку Кублічы, даглядае музей, наводзіць парадак на падворку, адчыняе дзверы, калі прывозяць экскурсантаў. А раней працаваў вадзіцелем у гаспадарцы.

**— Ці былі вы знаёмы з Быкавым?** — пытаю я мужчыну.

— Я — яго пляменнік. Мой тата — родны брат Быкава. Цяпер мне 55 гадоў. З дзяцінства яго добра памятаю. Прыязджаў дзядзька Вася заўсёды з гасцінцамі. Аднойчы «Кока-колу» мне прывёз — тады гэтага напою ў нас не прадавалі. Во шчасце было! — расказвае ён.

Паводле слоў Мікалая Мікалаевіча, Васіль Быкаў быў вельмі сціплым чалавекам, маўклівым. Прыедзе, запытае: маўляў, ці жывыя ўсе, як здароўе, як гаспадарка? Шмат пра свае справы не расказваў.

— Ён да нас штогод прыязджаў, бывала, і не раз. І я ў яго гасціў: у Гродне, Мінску, — працягвае Мікалай Харак.

Васіль Уладзіміравіч, нягледзячы на занятасць, заўсёды знаходзіў час, каб наведаць родных. Напрыклад, калі пляменнік служыў пад Мінскам у арміі, некалькі разоў прыязджаў да яго. А пасля дэмабілізацыі дапамог касцюм купіць. Захаваліся лісты Быкава сваякам. Два лісты Мікалай Мікалаевіч у дзень нашай размовы перадаў у дар музею.

— Менавіта дзядзька ў дзень майго вяселля адвёз мяне на сваёй «Волзе» ў вёску па нявесту, — працягвае суразмоўца. Нядаўна тую машыну купіў. А раней у яго «Жыгулі» былі. Канешне, у той час каб жаніха прывезлі на такім шыкоўным аўто, ды яшчэ за рулём быў такі чалавек — гэта было вельмі прэстыжна. Ён быў добрым вадзіцелем і не давяраў нікому садзіцца за руль. Калі прыязджаў да нас, любіў на рыбу хадзіць. Мы тое возера цяпер так і называем — «Быкаўскае».

Разам зайшлі ў дом Быкава, спыніліся каля партрэта Васіля Уладзіміравіча. Я заўважыў, што пляменнік, якога я спецыяльна папрасіў стаць побач, каб зрабіць ягоны здымак, вельмі падобны на пісьменніка. Мікалай Мікалаевіч прызнаўся, што літаратурны дар яму не перадаўся, як і іншым сваякам Быкава. Але характар у пляменніка, як мне падалося, як і ў яго знакамітага дзядзькі: ён такі ж спакойны, ветлівы, не гаварлівы...

**Менавіта дзядзька ў дзень майго вяселля адвёз мяне на сваёй «Волзе» ў вёску па нявесту. У той час каб жаніха прывезлі на такім шыкоўным аўто, ды яшчэ за рулём быў такі чалавек — гэта было вельмі прэстыжна.**

### ДОМ ПЛОШЧАЙ 42 КВ.М

Наталля Марковіч, намеснік старшыні Ушацкага райвыканкама расказала пра музей Быкава. Будынак плошчай усяго 42 кв.м — дакладная копія дома Быкава. Музей адкрыўся тут 10 гадоў таму. Ён унікальны тым, што працуе толькі тады, калі нехта прыязджае ў Бычкі, каб пабываць у доме Майстра слова. Турыстаў суправаджае экскурсавод з раённага музея.

— Сапраўдны дом, у якім жыў будучы пісьменнік разам з бацькамі, сястрой і братам, пабудавалі яшчэ ў пачатку 1930-х гадоў. Зразумела, што такі стары будынак з часам разбураўся: праваліліся столь і падлога, у дрэнным стане была печ. Цяперашні дом — дакладная копія. Але ўнутры — адноўлены інтэр'ер, сярод экспанатаў — прадметы, якія належалі сям'і Быкава. У экспазіцыі — дакументы, фотаздымкі, кнігі з аўтографамі вядомых людзей, кнігі і часопісы з творамі Быкава, копіі малюнкаў і асабістыя рэчы пісьменніка. Жыхары вёскі Бычкі з задавальненнем прыносілі ў музей рэчы мінулых гадоў, — расказала яна.

На тэрыторыі падворка — хлеў, гумно, дрэвы, якія пасадзіў бацька Быкава.

Нядаўна быў праведзены абласны мастацкі пленэр імя В.У. Быкава, прысвечаны 70-й гадавіне вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У ліпені будзе арганізавана выстава твораў — у раённым музеі народнай славы. Мастакі паабяцалі па адной рабоце падарыць.

### «ЁН ПА НАЧАХ ПІСАЦЬ ЛЮБІЎ»

У вёсцы Бычкі цяпер жывуць менш за дваццаць чалавек — усе пенсіянеры. Два разы ў тыдзень прыязджае аўталаўка, па выкліку — хуткая дапамога. Тутэйшыя жыхары на жыццё не скардзяцца. Ганарацца, што яны землякі Быкава! Жыве ў Бычках і 76-гадовая Антаніна Аляксандраўна — мама Мікалая Мікалаевіча. Цікава, што ў яе доме калісьці з вясковай дзятвой займаўся настаўнік. Такім чынам, можна сказаць, што жыве бабуля Антаніна таксама ў вельмі знакавым месцы, звязаным з Быкавым.

— Я раней у іншай вёсцы жыла. Вядома, хвалявалася перад знаёмствам з Васілём Быкавым. Я жонкай яго малодшага брата была. Муж мой памёр. Памятаю, прыехаў Васіль, а страху я нацярпелася! Як весці сябе падчас стасункаў з такім чалавекам? А ён, я адразу пачула, быў вельмі простым чалавекам. Пацікавіўся: адкуль я, чым займаюся? Ну, мне і спакойна адразу стала. Я і да яго ў госці ездзіла. Памятаю, у Мінску гасціла. Ноч на двары, гляджу, а ў яго ў кабінеце святло ўсё гарыць і гарыць. А я на новым месцы не магу спаць. Ноч не спала і ўсё слухала. Ірына, жонка яго таксама не спала. Ён, можа, гадзіны ў тры толькі выключыў святло. Ірына пасля мне патлумачыла: «А ў нас так: ноч сядзім, днём спім. Не тое, што ў вас — у вёсцы, калі ўставаць вельмі рана трэба». А ён жа хворы быў — астматык, нават на падушцы не спаў, — дзеліцца ўспамінамі жанчына.

Антаніна Аляксандраўна працавала на будоўлі, у гандлі. Сказала, што пісьменнік дапамог купіць дом, у якім мы размаўлялі.

— Як гэтую хату куплялі, ён даў 500 рублёў — вялікія грошы на той час. Такі ён быў — не сквапны. Я назбірала грошай, каб доўг аддаць, але ён не ўзяў. Сказаў, «хай будзе мой уклад». Мо яшчэ і таму, што ён жа хадзіў у гэтай хаце ў 1 клас. Тады, памятаю, калі гэтую хату купілі, ён прыехаў. І гляджу, што ён ходзіць па хаце. І кажа: «Во, мая парта тут стаяла».

Заўсёды з падарункамі прыязджаў, бо ведаў, што ў вёсцы, акрамя малака і сала, няма нічога, — расказвае бабуля.

Антаніна Аляксандраўна прызналася, што, калі быў добры зрок, любіла чытаць творы Быкава — «Альпійскую баладу», «Мёртвым не баліць»...

— Коля мой, калі быў маленькім, памятаю, робіць урокі, а пад кніжкамі — дзядзькавы апавяданні, — працягвае сваячка пісьменніка.

Яна з болем успамінала пасляваенныя гады, калі ледзь не памерла ад голаду. І сям'я Быкавых галадала. Нягледзячы на дрэннае здароўе, і цяпер працуе на вялікім агародзе.

— Жыць у вёсцы можна. Шкада, здароўя няма. У вёсцы ж трэба працаваць. Парасяты і куры ёсць, карову ўжо не трымаю — сілы няма, рукі баляць. А агарод вялікі — сотак 30. Бульбу патроху садзім, цыбулю, — расказвае пра гаспадарскія клопаты бабуля.

Сказала, што да Быкава ў Бычкі часта прыязджаюць і іншаземцы. Напрыклад, прыязджалі французы на роварах. Таксама пыталіся: якім быў Быкаў?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**
*Ушацкі раён — Віцебск*

■ Падзея

# СКАРЫНА ПАЙШОЎ У ЛЮДЗІ

## ПРЭЗЕНТАВАНА 5 ФАКСІМІЛЬНЫХ ВЫДАННЯЎ КНІГ БІБЛІІ НАШАГА ПЕРШАДРУКАРА

**У 2013 годзе быў распачаты праект па перавыданні кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. Зусім нядаўна «Звязда» пісала пра падпісанне ў друк першага тома, пра яго выданне, а сёння мы можам бачыць ужо 5 кніг Скарыны. Плануецца, што да 2017 года — 500-годдзя айчыннага кнігадрукавання — усе 20 кніг Скарыны зноў убачаць свет у факсімільным выданні.**

Учора ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася ўрачыстая прэзентацыя перавыдадзеных кніг Бібліі. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі дыпламатычных місій тых краін, якія пэўным чынам былі звязаны з нашым першадрукаром, — Германіі, Італіі, Польшчы, Расіі, Украіны і Чэхіі. Усе яны атрымалі ў дар каштоўныя выданні. Прадстаўнікі раённых бібліятэк Мінскай вобласці таксама вернуцца ў свае ўстановы з гэтымі кніжнымі падарункамі.



Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ і дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ.



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

**Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ,** які ўдзельнічаў ва ўрачыстасці, адзначыў:

— Пакуль пачыналася гэтая імпрэза, у мяне з'явілася думка, што той, хто першым дайшоў да стварэння кнігі, такой найвялікшай каштоўнасці ўсяго чалавецтва, пэўна, вельмі хацеў адысці ад тлуму гэтага жыцця, ад віру падзей і імкнуўся да цішыні, каб мець магчымасць застацца сам-насам з кнігай. Я вельмі рады, што мы ладзім гэты кніжны праект, бо ён яшчэ раз падкрэслівае, што Скарына быў чалавекам не толькі беларускай культуры, але і ўсёй еўрапейскай, які зрабіў у яе вялікі ўнёсак. Ён быў тым, хто ў сярэднявечным свеце падарыў многім народам хрысціянскую кнігу.

Адзіны арыгінальны збор выданняў Скарыны ў нашай краіне сёння захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы. Яе **дырэктар Раман МАТУЛЬСКІ** заўважыў:

— Гэтым праектам мы спрабуем вярнуць свету тую спадчыну, якая была назапашана ў свой час, і паспрабаваць узнавіць эпоху Францыска Скарыны. Тады ён рабіў амаль неверагоднае: кнігі, на вытворчасць якіх патрэбен быў год, а то і дзесяцігоддзе, пачалі з'яўляцца за некалькі тыдняў; кнігі, на якія неабходна было патраціць цэлыя маёнткі, сталі каштаваць, дзякуючы накладам, нашмат танней; кнігі, да якіх раней маглі дакранацца толькі святары, сталі даступнымі шырокаму колу чытачоў. Скарына перавёў кнігі з катэгорыі выключна царкоўнага ўжытку ў «энцыклапедыю чалавека», як ён сам піша ва ўступным слове да Бібліі, той падручнік, па якім маглі вучыцца многія. Гэта сведчыць і пра высокі ўзровень грамадства, якое магло ўспрыняць такія выданні, бо кнігі сапраўды пайшлі ў людзі…

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Далучайцеся!

## КНІГА ПАДАРОЖНІЧАЕ ПА РОЗНЫХ АДРАСАХ

Сёння Узда і Уздзенскі раён сустракаюць акцыю Міністэрства інфармацыі, Мінскага аблвыканкама, Саюза пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкага дома «Звязда» «Лета з добрай кнігай». У раённым палацы культуры бібліятэкары, настаўнікі і юныя чытачы наладзілі святочную імпрэзу. А дапамаглі ім у гэтым і Уздзенскі райвыканкам, і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў Цыдзік. Знайшліся і спонсары сапраўды творчага праекта, якія набылі для бібліятэк Уздзеншчыны каля 300 дзіцячых кніг. Салаўіным краем называюць мясціны, якія выпеставалі Кандрата Крапіву, Паўлюка Труса, Антона Бялевіча, Пятра Глебку, Лідзію Арабей, Васіля Шырко і іншых руплівцаў на ніве мастацкага слова. Безумоўна ж, арганізоўваючы акцыю, скіраваную на пашырэнне чытацкай прасторы, развіццё ўвагі да друкаванай кнігі, і ў Міністэрстве інфармацыі, і ў СПБ, і ў выдавецтвах краіны спадзяюцца на тое, што галоўнымі завадатарамі гэтай справы выступяць найперш пісьменнікі — тыя, хто сёння стварае новыя кнігі.

**Мікола БЕРЛЕЖ**